ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
26
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 34 (1334)
Выходзіць раз у тыдзень

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

## НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна «Актуальныя праблемы грамадскіх і прыродазнаўчых навук», прысвечаная 60-годдзю універсітэта, адбудзецца 2—3 снежня. Пленарнае пасяджэнне — 2 снежня ў 10.00 у актавай зале галоўнага корпуса. На пасяджэннях 12 секцый будзе заслухана 286 дакладаў. Аргкамітэт запрашае маладых вучоных і студэнтаў прыняць удзел у рабоце канферэнцыі.

Т. ДАНІЛЕНКА,
член савета маладых вучоных.

## СЯБРОЎСКАЯ СУСТРЭЧА

першакурснікаў рускага аддзялення філфака з курсантамі Вышэйшага інжынернага зенітна-ракетнага вучылішча СПА адбылася на філалагічным факультэце. Цікавую праграму вечара склалі В. Хусанава, А. Хауліна, І. Трубнікава. На сустрэчы прысутнічалі студэнты з замежных краін, якія навучаюцца ў БДУ.

І. ПАПУРЭНКА,
студэнтка філфака.

## КЛУБ АМАТАРАЎ

архітэктуры, гісторыі і культуры створаны нядаўна на механіка-матэматычным факультэце. Клуб стаў цэнтрам арганізацыі экскурсій, прапаганды аховы старажытных помнікаў і збору матэрыялаў аб іх, знаёмства са здабыткамі беларускай нацыянальнай культуры, эстэтычнага выхавання студэнтаў.

І. ПОЛЗІК,
кіраўнік клуба.




# КАМСАМОЛЕЦ!

На ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва, ва ўсіх справах адчуваецца ўпэўнены поступ XI пяцігодкі, у выкананне планаў якой уліваецца і твая праца, праца камсамольца-студэнта, маладога вучонага, байца студэнцкага атрада.

Табе выпаў вялікі гонар — у ліку іншых дэлегатаў ад амаль 11-тысячнай камсамольскай сям'і флагмана вышэйшай школы рэспублікі—падвесці вынікі работы за два гады і намеціць перспектыву на будучыню. Мінулы 1980 і 1981 гады азнаменаваліся новымі поспехамі ў працы і вучобе. Ты памятаеш усмешкі на тварах рабят пры выглядзе новых кіламетраў укладзеных рэйкаў БАМа. Гэта ты, нягледзячы на дождж і слоту, дапамагаў убіраць «другі» хлеб у калгасах і саўгасах Магілёўшчыны, тваімі рукамі пабудавана студэнцкае кафэ «Гаўдэамус». Твае выступленні з канцэртамі мастацкай самадзейнасці добра памятаюць у падшэфных школах і прафтэхвучылішчах, у домакіраўніцтвах і воінскіх часцях.

Табе, сучаснік, выпаў гонар працягваць справу, пачатую бацькамі і дзядамі ў памятным 1917-м, дзеля якой яны жылі і змагаліся, якую абаранялі да апошняй кроплі крыві.

Менш чым праз паўгода моладзь нашай краіны будзе рапартаваць XIX з'езду ВЛКСМ аб ходзе выканання рашэнняў XXVI з'езда КПСС. Рыхтуючыся дастойна сустрэць 60-годдзе з дня ўтварэння СССР, XIX з'езд ВЛКСМ, XXVII з'езд ЛКСМ Беларусі, твой абавязак—вучыцца, працаваць і жыць па-ленінску; усе сілы, энергію, запал камсамольскіх сэрцаў аддаваць служэнню Радзіме.

Няхай ленінскі запавет «вучыцца камунізму» стане сэнсам твайго жыцця. Поспехаў табе ў працы, добрага настрою, новых здзяйсненняў на карысць любімай Радзімы!

(Матэрыялы 2-й і 3-й старонак прысвечаны справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі універсітэта).

## ● ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ

# У добры час!

У ПЕРШАКУРСНІКАЎ геаграфічнага факультэта свята вясёлае і хвалюючае — пасвячэнне ў студэнты. Навокал — радасныя твары, усмешкі, музыка. Першакурснікаў лёгка можна распазнаць не толькі па іх жартоўных эмблемах, а і па тварах — асабліва жыццярадасных і вясёлых.

...Надыходзіць самы ўрачысты момант вечара. Каралева Геафакіі зачытвае ўрачыстую клятву. Першакурснікі ў прыўзнятым настроі абяцаюць выконваць студэнцкія абавязкі.

Пасля гэтага старшакурснікі ўрачыста перадаюць сімвалічны ключ «ад сэрца дэкана» і сімвалічны, даволі ўнушальных памераў студэнцкі білет, які падпісвае намеснік дэкана геафака Р. А. Жмайдзяк. «Гімн геафака» спявае ўся зала. І ў агульны хор уліваюцца маладыя звонкія галасы рабят, якія толькі што сталі «сапраўднымі студэнтамі».

В. ЖДАНКО,
студэнт журфака.

## ● З НАШАЙ ПОШТЫ

# На радзіме паэта

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі вялікая ўвага ўдзяляецца рабоце з замежнымі студэнтамі. Для іх арганізуюцца цікавыя экскурсіі, сустрэчы, гутаркі. Зусім нядаўна група замежных студэнтаў пабывала на радзіме беларускага паэта Янкі Купалы — у Вязынцы.

Домік, у якім жыў паэт, стаіць у вельмі прыгожым месцы, пад засенню ліп і клёнаў. Мы доўга блукалі па купалаўскіх месцах, слухаючы расказ экскурсавода аб цяжкім жыццёвым шляху паэта, аб яго творах. Многія з нас слухалі вершы Купалы ўпершыню, і гэта надало нашай экскурсіі яшчэ больш цікавы і прыцягальны характар.

Безумоўна, гэта вельмі патрэбна і важна — бліжэй даведацца аб краіне, якая на даволі доўгі час стала нашым родным домам. Экскурсія ў Вязынку — яшчэ адна цікавая старонка нашага жыцця ў СССР. Мы пазнаёміліся з багатай культурай беларускага народа.

РАЗАФІНДРАЛАМБУ ЛЕОН,
студэнт журфака.

# БЫЦЬ ВЕРНЫМІ СПРАВЕ БАЦЬКОЎ

«УСПАМІНЫ» — новы твор Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Леаніда Ільіча Брэжнева — пакінулі глыбокі след у душах студэнтаў нашай навучальнай установы. Яскравае сведчанне гэтага —канферэнцыя чытачоў, прайшоўшая на гістарычным факультэце, якую падрыхтавалі савет ветэранаў вайны універсітэта, аддзел абслугоўвання бібліятэкі і дэканат гістарычнага факультэта.

Канферэнцыю, у прэзідыуме якой разам з выкладчыкамі факультэта — прадстаўнікі рэктарата, камсамольскай, партыйнай арганізацый БДУ, Маскоўскага раённага камітэта партыі, ветэраны слаўнай 18-й арміі, адкрыла дэкан гістарычнага факультэта прафесар І. В. Царук.

«Умець па-сапраўднаму жыць і працаваць», «Выхоўваць пачуццё асабістай адказнасці за даручаную справу», «Маладым будаваць заўтрашні дзень, сынам працягваць справу бацькоў» — вось тэмы, з якімі выступілі на канферэнцыі студэнты М. Новікаў, Л. Курыловіч, С. Старкоў.

Успамінамі аб барацьбе і працы дзяліліся з прысутнымі старшыня савета ветэранаў вайны палкоўнік у адстаўцы І. В. Марчанка, былыя воіны 18-й арміі А. А. Пусянкоў і І. М. Макішаў (апошняму ў гады вайны ўручыў партыйны білет Л. І. Брэжнеў).

Вынікі канферэнцыі падвёў сакратар партыйнага камітэта універсітэта дацэнт М. Г. Елісееў.

А. РУКШЫН,
загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі.



На здымку: у час канферэнцыі чытачоў.
Фота Г. Красоўскага.

# КАМСАМОЛЬСКІМ ЮНАЦТВАМ СВАІМ!





● ТВАЕ ВЫХАВАНЦЫ, КАМСАМОЛ!

## САКРЭТ ШЧАСЦЯ

**А. Г. Слука — дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі, кандыдат гістарычных навук, загадчык падрыхтоўчага аддзялення, член шматлікіх грамадскіх саветаў і арганізацый... Гэта чалавек, для якога жыццё неаддзельнае ад працы.**

**«— ...Нам трэба падрабязней спыніцца на пытанні аб тым, чаму мы павінны вучыць і як павінна вучыцца моладзь, калі яна сапраўды хоча апраўдаць званне камуністычнай моладзі», — гаварыў У. І. Ленін. III Усерасійскі з'езд РКСМ паставіў перад моладдзю наступную задачу — вучыцца камунізму. Якім шляхам ваша пакаленне ажыццяўляла ленінскі запавет!**

— Маё пакаленне — дзеці ваенных гадоў. Дзяцінства наша было азмрочана трывожнымі саракавымі. Кожны на сабе адчуў сляды той суровай пары. У аднаго з вайны не вярнуўся бацька, у другога без вестак прапаў брат... Але прыйшла Перамога. Перад намі, камсамольцамі 50—60-х, паўстала адна задача — будаваць прыгожае, поўнае сэнсу і радасці жыццё. Свой абавязак мы бачылі ў сумленнай працы. Працавалі так, каб вынікамі сваёй работы прыносіць больш задавальнення іншым, чым сабе. У цяжкіх умовах наша пакаленне вучылася цаніць і даражыць кожнай хвілінай. Мы кіраваліся неабходнасцю працоўнага ўдзелу ў жыцці. Гэта і было той своеасаблівай прыстанню, з якой пачыналася наша камсамольская біяграфія...

**— Што значыць «вучыцца камунізму»!..**

— Вучыцца камунізму — гэта значыць вучыцца такому жыццю, пры якім кожны чалавек будзе максімальна аддаваць свае фізічныя і духоўныя сілы. Калі ўдзельнічаць — то актыўна (дарэчы, «занасілі» мы гэта слова), калі працаваць — то эфектыўна. Вучыцца камунізму — значыць паставіць перад сабой вялікую мэту і ўсе свае думкі, намаганні накіроўваць на яе ажыццяўленне.

**— Што даў вам камсамол у жыцці!**

— З камсамолам у мяне звязаны самыя светлыя і добрыя ўспаміны. Яму я абавязаны ўсім лепшым. Камсамол навучыў мяне жыць і працаваць.

Любяць некаторыя скардзіцца на адсутнасць таленту, але гэта — глупства! Кожны з людзей па-свойму таленавіты. Згодзен, ёсць талент-самародак, але акрамя яго ёсць і талент, народжаны карпатлівай штодзённай працай.

**— Што дае вам праца з моладдзю!**

— Працуючы з моладдзю — мы жывём. Я не магу ўявіць сябе без моладзі, бо гэта яна, як свежы ветрык, уносіць у грамадства нешта сваё — новае, адметнае, ад якога міжволі забываеш розніцу ў гадах. Лічу, што кожны, падкрэсліваю, іменна кожны выкладчык павінен працаваць з маладымі. Калі адмахвацца ад іх, як кажуць, рукамі і нагамі, не дзяліцца набытым вопытам, хіба ж выканаем мы, камуністы, сваё важнейшае партыйнае даручэнне? Каму, як не нам, рыхтаваць маладзейшае пакаленне да жыцця, завешчанага Леніным?

**— Самая памятная падзея ў вашым жыцці, звязаная з камсамолам!**

— У маім жыцці было шмат памятных дат. Але ўручэнне прэміі Ленінскага камсамола Беларусі — самае хвалюючае.

**— Вашы пажаданні камсамольскай моладзі!**

— Трэба вучыцца. Вучыцца таму, што патрабуе ад нас партыя і што неабходна народу.

**У час размовы я не запыталася ў Алега Георгіевіча, ці шчаслівы ён. Такое пытанне здалося мне лішнім і крыху недарэчным. Я бачыла яго кнігу, тоўстыя папкі з надрукаванымі матэрыяламі і бялюткі аркуш паперы... Я бачыла адкрыты погляд, іскрыстую, шчырую ўсмешку і шчаслівыя вочы...**

**Умець прымаць жыццё і ўмець радавацца яму — ці не ў гэтым сакрэт Шчасця!**

**Г. КОЗЕЛ,**
**наш спец. кар.**

## ПРАЦАЙ АДЛІТЫ РАПАРТА РАДОК

**У ходзе аперацыі «Летапіс народнай славы» студэнтамі універсітэта устаноўлена больш 500 прозвішчаў студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, якія пайшлі са студэнцкіх аудыторый на франты Вялікай Айчыннай вайны. 9 мая 1981 года сумесна з Уздзенскім РК КПБ арганізаваны злёт былых партызан брыгады імя Варашылава.**

**1549 чалавек займаюцца на 15 аддзяленнях ФГП.**

**У трэцім працоўным семестры 1981 года 94 атрады агульнай колькасцю 2768 чалавек працавалі на аб'ектах Мінска і рэспублікі, у Карэліі і на БАМе, у раёнах Нечарназем'я, Іркуцкай вобласці, Малдавіі, Стаўрапольскім краі, Казахскай ССР, Алтайскім краі, Узбекскай ССР, ГДР. Будаўнічымі атрадамі асвоена больш 4 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў, здадзена ў эксплуатацыю 94 аб'екты вытворчага і культурна - бытавога прызначэння.**

**Камуністычны атрад механіка - матэматычнага факультэта «Арсенал» (камандзір Ю. Шастакоў) пабудаваў у Мінску 12 дзіцячых пляцовак, пералічыў у Фонд міру 3 тысячы рублёў.**

**Атрадамі праароблена вялікая грамадска - палітычная работа. Дадзена 846 канцэртаў, прачытана 1563 лекцыі, запісана 379 успамінаў ветэранаў вайны і працы.**

**Лепшымі факультэтамі па выніках трэцяга працоўнага семестра за апошнія два гады былі прызнаны механіка-матэматычны, юрыдычны, факультэт радыёфізікі і электронікі, фізічны.**

● КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

## Шукаць новыя формы

**ПАДВОДЗЯЧЫ вынікі работы універсітэцкай камсамольскай арганізацыі за два мінулыя гады, нельга не закрануць дзейнасць «Камсамольскага пражэктара».**

**Аб пошуках і дасягненнях «пражэктарыстаў» расказвае Галіна Ільяшчук:**

— «Камсамольскі пражэктар» —масавая форма ўдзелу камсамольцаў у грамадскім кантролі. Наша галоўная задача — развіваць у юнакоў і дзяўчат грамадскую актыўнасць, выхоўваць прынцыповасць, пачуццё асабістай адказнасці за справы універсітэта, факультэта, вучэбнай групы, змагацца за высокую якасць ведаў студэнтаў.

Як бачыце, пытанняў шмат. І таму агульны поспех залежыць ад сумесных намаганняў штабаў «КП» у падраздзяленнях. Ад іх зладжанасці, аператыўнасці. Лепшым з упэўненасцю можна назваць «Камсамольскі пражэктар» юрыдычнага факультэта.

У апошні час палепшылі сваю работу «пражэктарысты» механіка-матэматычнага, гістарычнага і радыёфізічнага факультэтаў. На жаль, не ў поўную сілу, без натхнення працавалі камсамольскія дазорныя факультэта журналістыкі і біяфака.

Работа «Камсамольскага пражэктара» будзе малаэфектыўнай, калі дрэнна працуе сектар інфармацыі. Гэты сектар аператыўна расказвае аб дзейнасці «пражэктарыстаў», прапагандуе перадавы вопыт. На кожным факультэце выпускаецца свой «баявы лісток», «маланкі». За справаздачны перыяд сектар інфармацыі «КП» БДУ імя У. І. Леніна заняў першае месца ў раёне сярод сродкаў галоснасці.

Калі гаварыць аб мерапрыемствах, праведзеных штабам «КП», можна назваць шматлікія рэйды-агляды сумесна з жыллёва-бытавой камісіяй мясцкома на прадпрыемствах грамадскага харчавання універсітэта. Перад пачаткам навучальнага года мы правяралі падрыхтоўку інтэрнатаў да прыёму студэнтаў.

Зроблена многае, але праблемы застаюцца, паколькі жыццё без іх немагчыма. «Камсамольскі пражэктар» павінен змагацца за іх вырашэнне. Для гэтага дазорныя факультэтаў павінны ўзаемадзейнічаць з камітэтам народнага кантролю, актывізаваць работу сваіх сектараў, каб высвятляць і выкараняць усё тое дрэннае, што перашкаджае руху наперад.

**Запісала**
**В. БАСАЛАЙ,**
**наш спец. кар.**

● СЛОВА АБ ФАКУЛЬТЭЦЕ

## ПЕРСПЕКТЫВЫ РОСТУ

электроніка цяпер, бадай, самыя сучасныя навукі. Іх магчымасці неабмежаваныя. Ці не прывабна, напрыклад, гучыць: спецыяліст па робатабудаванню? Не, пакуль што такой спецыяльнасці на факультэце няма. Але ў хуткім часе яна паявіцца. Рэспубліка становіцца цэнтрам робатабудавання. І ўжо цяпер вучоныя-радыёфізікі факультэта працуюць над праблемай стварэння так званага «штучнага інтэлекту», які будзе здольны выконваць адпаведную колькасць функцый чалавечага мозгу. Адсюль і ўзнікае неабходнасць адкрыцця на факультэце новых спецыяльнасцей: па робататэхніцы і біёніцы.

А як інакш, калі не з гонарам, можна гаварыць пра кафедру радыётэхнікі і фізічнай электронікі, якой у свой час кіраваў прафесар У. В. Ізох?

Увогуле навуковая работа на факультэце пастаўлена належным чынам. Дабіваюцца пэўных поспехаў у працы студэнцкія навукова - даследчыя лабараторыі. А ГНДЛ кафедры радыёфізікі і электронікі звышвысокіх частот, якой кіруе дацэнт У. І. Мікуловіч, атрымала першую прэмію (гэта значыць — першае месца ва універсітэце). Па-сур'ёзнаму заняўся навукай сёлетні выпускнік Пётр Каржукоў. Яшчэ ў час вучобы ён удзельнічаў у шматлікіх навукова-тэхнічных канферэнцыях рэспублікі і краіны. Сярод яго ўзнагарод пачэснае месца займаюць граматы савета НДРС і дыплом ВДНГ СССР. Цяпер П. Каржукоў займаецца ў аспірантуры па сваёй спецыяльнасці... Нядаўна групе супрацоўнікаў у саставе А. М. Казарына, А. С. Ключнікава, І. У. Краўчанкі, М. А. Вількоцкага і А. В. Ляпёхіна за паспяховыя навукова - даследчыя распрацоўкі была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР. Высокую ацэнку атрымалі выпушчаныя на факультэце падручнікі: «Электронная тэорыя паўправаднікоў», «Механіка»...

— Цудоўны калектыў склаўся ў нас, — адзначае намеснік дэкана Сяргей Гаўрылавіч Някляеў,— дружны. Ёсць усе магчымасці для таго, каб у недалёкім будучым наш факультэт па ўсіх паказчыках займаў толькі першыя месцы. Да гэтага імкнуцца ўсе — і выкладчыкі, і студэнты.

І сапраўды, за 5 гадоў існавання факультэт дабіўся значных поспехаў. Перш за ўсё — II месца сярод факультэтаў па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1980 год. За гэты ж год за факультэтам замацавана першае месца па будатрадаўскаму руху, а камісар СБА імя Купрыянава, намеснік сакратара камітэта камсамола Вячаслаў Малафееў быў узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку». Далей. Калі тры гады назад спартсмены факультэта займалі 8-е месца ў турнірнай табліцы, то сёлета — трэцяе.

Вялікія надзеі ўскладаюць студэнты на сёлетні агляд мастацкай самадзейнасці. Часта праводзіць рэпетыцыі мужчынскі хор, адраджаецца тэатр мініяцюр. Факультэцкая дыскатэка прызнана адной з лепшых ва універсітэце. Цікавымі, мастацка-змястоўнымі былі праведзеныя на факультэце вечар працоўнай славы, сустрэча з дэлегатам XXVI з'езда КПСС прафесарам В. М. Арцем'евым, вечар дружбы з балгарскімі студэнтамі. Дык чаму б не быць факультэту наперадзе і ў мастацкай самадзейнасці? На гэты ўчастак грамадскай дзейнасці прапанавалі звярнуць асаблівую ўвагу новаму камітэту камсамола, сакратаром якога радыёфізікі аднадушна выбралі выдатніка вучобы, ленінскага стыпендыята І. Андрушкевіча...

Факультэт радыёфізікі і электронікі — самы малады. Наперадзе — новыя навуковыя адкрыцці, новыя перамогі. Наперадзе — далейшая біяграфія факультэта, якую дзень за днём пішуць сваімі справамі выкладчыкі, студэнты, аспіранты — усе тыя, хто з гонарам называе сябе радыёфізікам.

**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**наш спец. кар.**







## ПРАЦАЙ АДЛІТЫ РАПАРТА РАДОК

**У 1980—1981 навучальным годзе ў БДУ імя У. І. Леніна праходзілі тыдні савецка-польскай, савецка - балгарскай, савецка - в'етнамскай, савецка-чэхаславацкай, савецка - кубінскай, савецка - іранскай, савецка - сірыйскай дружбы. З 16 па 23 красавіка 1981 года праводзіўся тыдзень салідарнасці, які адкрыўся фестывалем мастацкай творчасці замежных студэнтаў. Савецкія і замежныя студэнты пабывалі ў Брэсцкай крэпасці-герої, у Рызе. Завяршыўся тыдзень мітынгамі салідарнасці з народамі, якія змагаюцца за свабоду і незалежнасць.**

**У інтэрнатах універсітэта для замежных студэнтаў праводзіцца адзіны палітдзень па вывучэнню матэрыялаў XXVI з'езда КПСС.**

**Працягвае паспяховую работу дыскусійны клуб «Палітыкус», на пасяджэннях якога замежныя студэнты сумесна з савецкімі абмяркоўваюць важнейшыя міжнародныя праблемы сучаснасці.**

**У 1980—1981 годзе саветам дружбы і камітэтам камсамола Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна былі арганізаваны 3 інтэрнацыянальныя суботнікі, у якіх прынялі ўдзел больш 250 замежных студэнтаў.**

**За справаздачны перыяд камітэт камсамола прымаў маладзёжныя дэлегацыі з ГДР, ПНР, СРВ, Англіі, ФРГ, ЗША і іншых краін свету.**

**86 замежных студэнтаў выязджалі ў саставе СБА ў Малдаўскую ССР, г. Усць-Ілімск, Пскоўскую і Мінскую вобласці, Казахскую ССР, працавалі ў Мінску.**

# ШЧАСЛІВАГА ШЛЯХУ, СПАРТАКІЯДА!

**У ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫМ МАНЕЖЫ «ДЫНАМА» АДБЫЛОСЯ АДКРЫЦЦЕ XXX УНІВЕРСІТЭЦКАЙ СПАРТАКІЯДЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ 60-ГОДДЗЮ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

ФОТАРЭПАРТАЖ



НА БЕГАВЫЯ ДАРОЖКІ выходзяць першыя ўдзельнікі ўрачыстага парада. Гэта ветэраны студэнцкага спорту. Ім прадастаўлена права адкрыць урачыстае шэсце. У першых радах знаходзяцца чэмпіёны СССР, пераможцы многіх спаборніцтваў лёгкаатлеты Т. Бойка, І. Тарасюк, І. Дабралюбаў, А. Котаў, Б. Лютарэвіч, альпініст А. Фядэнка, веласіпедыст У. Воднеў, чэмпіёнка і рэкардсменка Еўропы водналыжніца І. Потэс. Услед за імі крочаць зборныя каманды універсітэта.

Па манежы праходзяць каманды па спартыўнай і мастацкай гімнастыцы, заняўшыя трэція месцы ў рэспубліканскай спартакіядзе. Іх змяняюць фехтавальшчыкі — неаднаразовыя прызёры першынства рэспублікі. Шмат перамог і ў барцоў класічнага стылю. Лёгкім крокам ідуць лёгкаатлеты, якія ўпісалі ў спартыўную гісторыю універсітэта не адну слаўную старонку. Побач з імі самыя тытулаваныя — цяжкаатлеты. Штангісты шмат разоў станавіліся чэмпіёнамі рэспублікі, удала выступалі на ўсесаюзных турнірах. Шырока універсітэт прадстаўлены іграvымі відамі спорту. Нашы зборныя па валейболу, футболу і баскетболу з году ў год займаюць прызавыя месцы, становяцца чэмпіёнамі рэспублікі. Хутка растуць поспехі веласіпедыстаў. У гэтым годзе яны на студэнцкай спартакіядзе былі другімі, дабіўшыся права выступаць на ўсесаюзнай універсіядзе.

Да спартсменаў з прывітальным словам звяртаюцца член парткома універсітэта, старшыня савета ветэранаў вайны дацэнт І. В. Марчанка; першы майстар спорту універсітэта ў пасляваенныя гады, выпускнік аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кінарэжысёр І. Дабралюбаў.

Спартакіяда аб'яўляецца адкрытай. Права падняць сцяг прадастаўляецца майстрам спорту СССР студэнтцы журфака Ірыне Білейчык, студэнтам юрфака Мікалаю Рубісу і Валерыю Лабузаву...

Калоны пакідаюць залу. Але свята працягваецца. З паказальнай праграмай выступаюць гімнасты, фехтавальшчыкі, барцы. Веласіпедысты змагаюцца ў гонцы з выбываннем, і вось радасна ўскідвае рукі студэнт юрфака майстар спорту СССР Ігар Крэсік — ён пераможца!

Першыя ачкі запісалі лёгкаатлеты. Праведзеныя забегі ў эстафеце ўключаны ў спаборніцтвы спартакіяды. Адразу ўперад кінуліся дзяўчаты філфака. Хутка яны перадаюць эстафетную палачку і фінішыруюць у забегу першымі. Тры этапы (600 м+400 м+200 м) пераадолены за 3 мінуты 31,5 секунды. Але ўсе чакаюць выступлення мацнейшых. Пасля першых кругоў бегу бачна, што філфакаўцы могуць перамагчы. І толькі ўпэўнены бег на апошніх этапах моцнай каманды мехмата дазволіў заняць ёй першае месца. Філфак — на другім. Трэцімі былі спартсмены геафака. На жаль, не абышлося і без «сюрпрызаў». Каманды дзяўчат гістарычнага, фізічнага і біялагічнага факультэтаў у эстафеце не ўдзельнічалі.

У мужчын некаторыя факультэты выступалі двума саставамі. Ніхто не змог аказаць супраціўлення камандзе механіка-матэматычнага факультэта. Другімі былі гісторыкі, а на трэцім месцы — бегуны ФПМ.



**У. АБРАМОВІЧ,**
**В. ШАЧАК** (фота).

**СПАРТЫЎНАЕ АРЫЕНТАВАННЕ**

## ГАЛОЎНАЕ — УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ

**ЭЛЕКТРЫЧКА хутка ідзе ў бок Маладзечна. Вось ужо і Мінскае мора, і Ждановічы засталіся ззаду. Нам выходзіць на станцыі Крыжоўка, дзе сёння адбудуцца спаборніцтвы па спартыўнаму арыентаванню...**

**— А ці доўга мы там будзем? — спытала мяне Жанна Жмайлік, студэнтка факультэта журналістыкі.**

**Я не магу дакладна адказаць. Усё залежыць ад падрыхтаванасці спартсменаў. Кожны ўдзельнік спаборніцтваў павінен укласціся ў паўтары гадзіны. І толькі тады час будзе залічаны. Гэта не так проста. Трэба па компасу і карце знайсці 7 пікетаў. Прытым прабегчы давядзецца не менш як 8—9 кіламетраў.**

**...— Нумар 101 — на старт! — аб'явіў галоўны суддзя.**

**Праз шэсць мінут стартаваць Ігару Рыбалтоўскаму.**

**— Ты глядзі, спачатку не выкладвайся. Раўнамерна размяркоўвай сілы, — кожнаму хацелася дапамагчы парадай.**

**— Нічога, рабяты, не хвалюйцеся! — падбадзёрваў каманды суддзя. — Апошнімі ўжо ніяк не будзеце. Не ўсе факультэты на спаборніцтвы з'явіліся. Мабыць, студэнты дажджу баяцца. А ці ж сапраўднага спартсмена напалохаеш?**

**— Не, вядома! — запэўніла адна дзяўчына дрыжачым голасам.**

**...Потым быў фініш. Спартсмены-разраднікі паказалі нядрэнныя вынікі. А вось з навічкамі было крыху інакш.**

**— А чорт яго ведае, дзе той пяты пікет! — хлопец цяжка дыхаў і падскокваў на месцы, каб не замерзнуць. — Як у ваду кануў!**

**Потым высветлілася, што «у ваду кануў» не толькі пяты пікет, але і некаторыя студэнты. Дзве дзяўчыны зусім не з'явіліся на фініш.**

**— Яны ў Мінск паехалі. Нават паліто тут засталіся. Замерзлі, відаць... — смяяліся рабяты.**

**Дамоў ехалі ўжо цемрай. У вагоне было цёпла. Хлопцы ажыўлена гутарылі паміж сабой. А дзяўчаты адразу пазасыналі. Прытаміліся крыху..**

**Гэта нічога, што ў некаторых не будзе прызавога месца. Як сказаў П'ер дэ Кубертэн: «Галоўнае — не перамагаць, галоўнае — удзельнічаць!»**

**У. ДЭН**

**ДНІ ЗДАРОЎЯ**

## ЗАПРАШАЕМ НА СТАРТ

**«Галоўная задача фізкультурнага руху, усёй сістэмы фізічнай адукацыі — усямерна садзейнічаць умацаванню здароўя савецкіх людзей, павышэнню іх працаздольнасці і прадукцыйнасці працы, гатоўнасці да абароны Радзімы».**

*(З пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым уздыме масавасці фізічнай культуры і спорту».*

Спартыўна-масавая камісія мясцовага камітэта прыняла пастанову аб правядзенні дзён здароўя для супрацоўнікаў факультэтаў, падраздзяленняў. Складзены праграма мерапрыемстваў і графік іх правядзення.

Першымі на старт выйшлі супрацоўнікі фізічнага факультэта. Яны спаборнічалі ў кіданні гранаты і ў бегу на 400 і 800 метраў. У кіданні гранаты большасць удзельнікаў перайшла 40-метровы рубеж. Гэта вельмі высокі паказчык. У бегу на 800 метраў перамагла А. Ігнаценка з кафедры біяфізікі.

Удзел у гэтых спаборніцтвах усім спадабаўся. Аднак ці можам мы быць задаволены, калі ў добра арганізаваных спаборніцтвах прымае ўдзел толькі 30 чалавек? Канешне, не.

Адказным за спартыўна-масавую работу сярод супрацоўнікаў трэба лепш рыхтавацца да правядзення падобных мерапрыемстваў. Пры неабходнасці трэба звяртацца і да дапамогі кіраўнікоў факультэтаў, падраздзяленняў. Асаблівую ўвагу належыць звяртаць на прыцягненне да рэгулярных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі асоб сярэдняга і старэйшага ўзросту.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшыня спартыўна-масавай камісіі мясцкома.**

**ТОЛЬКІ ФАКТ**

## Пачалося першынство

Мінска па міні-футболу. 100 каманд-удзельніц разбіты на 5 падгруп. У спаборніцтвах удзельнічаюць 4 каманды з універсітэта (юрфак, біяфак, геафак, мехмат). Ужо адбыліся першыя матчы.

Каманда «Біёлаг» выйграла з лікам 1:0 у каманды БДІФК, а каманда «Географ-81» з лікам 2:0 перамагла каманду «Лінгвіст» Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў.

**С. КАРНЕЙЧЫК,**
**студэнт геафака.**

**ПРАБЛЕМА ДАЎГАЛЕЦЦЯ Ў СПОРЦЕ**

## КРОПКІ НАД «І»...

«...Невялічкая такая дзяўчынка. А крокі шырокія... І бег вельмі тэхнічны! Асабліва на віражах, калі робіць паскарэнне. Здавалася, што яна ляціць, ледзь дакранаючыся падэшвамі да асфальту...»

Такой запомнілі Таню Кіцічэнка яе сяброўкі па камандзе.

«...Лёгкая атлетыка — каралева спорту. Таццяне заўсёды не цярпелася адолець гэту каралеву. За якія-небудзь секунды яна выкладвае ўсю сваю натрэніраванасць. І ўвесь запас сіл ідзе на 60 ці 100 метраў. Не кожны спрынтэр здольны на гэта...»

Я сустрэўся з Таняй на стадыёне. Але яна ўжо не бегала.

— На гэты раз — кропка, — дзяўчына гаварыла цвёрда, але выгляд у яе быў крыху разгублены. — Два разы збіралася кідаць спорт. Але ўсё не хапала сіл... Яшчэ трэнер, Валянціна Зарэцкая... Колькі разоў я гаварыла: «Не хачу, не буду». А Валянціна Васільеўна прымушала. З самай звычайнай трэніроўкі яна рабіла свята. Магла зацікавіць. Але хопіць. Усё жыццё не прабегаеш...

Сапраўды. Заўсёды павінен наступіць той момант, калі прыйдзецца пакінуць бегавую дарожку, павесіць на сцяну баксёрскія пальчаткі, развітацца са штангай. І ўсё ж, калі? Пытанне, якое хвалюе кожнага спартсмена.

Для Тані Кіцічэнка яно зараз на першым плане...

— Мой спартыўны лёс склаўся, мабыць, як і ў іншых. Лёгкай атлетыкай пачала займацца ў восьмым класе. Крыху пазнавата, але пайшло на здзіўленне лёгка. Ужо праз год мела першы дарослы разрад. Закончыла школу, паспрабавала паступіць на біяфак. Не хапіла балаў. На душы было вельмі цяжка. Дзякуй маім першым трэнерам — А. І. Ткачатковай і В. Н. Данскому. Падтрымалі добрым словам, парадай... Ну і работа на бегавой дарожцы. Да сёмага поту... У 1978 годзе паступіла на вячэрняе аддзяленне біялагічнага факультэта. За гэты час стала кандыдатам у майстры спорту СССР. Выступала ў зборнай Беларусі, універсітэта... Цяпер надышла пара падвесці рысу. Не хапае часу на трэніроўкі. Работа, вучоба. Як ніяк — чацвёрты курс...

Здаецца, што тут разважаць?! Спорт — гэта добра, але ў чалавека ёсць яшчэ і праца, і асабістае жыццё.

«...На тых спаборніцтвах Таццяне папаліся моцныя сапернікі. Яна нервавалася... Потым няўдалы старт. Сутарга скруціла нагу і...»

Дамоў Таню везлі на машыне. Доўга не ўставала з ложка. Лячылі масажам, гіпнозам... Праз шэсць месяцаў зноў пачала трэніравацца.

— Часам думаю: трэба было паступаць у медыцынскі. Мяне заўсёды хвалявалі пытанні траўматалогіі. Але на біяфаку таксама вывучаюць фізіялогію чалавека...

І прафесію абраць дапамог Таццяне спорт. Але яна вырашыла з ім расстацца. Канешне, дзяўчына калі-небудзь будзе прыходзіць на трэніроўкі, гуляць у баскетбол, выступаць за факультэт на спаборніцтвах...

Узнікае пытанне: ці здольна цяпер Таня палепшыць свае спартыўныя рэзультаты?

— Яшчэ як здольна! — Валянціна Васільеўна Зарэцкая хвалюецца. — Да трыццаці гадоў ёй можна трэніравацца. Я па сабе мяркую. Самы лепшы свой рэзультат я паказала ў 29 гадоў. Толькі сур'ёзная траўма прымусіла мяне пакінуць спорт. Прыйду, бывае, на стадыён, пачую, як аб'яўляюць забег на 200—400 метраў, і пачынаю плакаць. Так сумна на сэрцы робіцца. Таню гэта таксама чакае. Але ёй яшчэ бегаць і бегаць. Яна зараз у форме. І нага ў парадку. А час заўсёды знойдзеш, калі моцна захацець. Выкручвалася ж неяк раней...

Вось і думай, як тут быць. Таццяна для сябе прыняла вельмі цвёрдае рашэнне.

Але ці не рана ставіць кропкі над «і»?

**У. ДАШУК,**
**наш кар.**



**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

26 лістапада 1981 г.

Заказ 1867 АТ 06848

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁУ